ГАЗЕТА УЗНАГАРОДЖАНА ГАНАРОВАЙ ГРАМАТАЙ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА БССР

# БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

ГАЗЕТА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА

26 ВЕРАСНЯ 1996 года чацвер

№13 (1749)

# Сустрэча з рэктарам



*12 верасня адбылася сустрэча студэнтаў Белдзяржуніверсітэта з рэктарам і прарэктарамі. Аляксандр Уладзіслававіч азнаёміў прысутных з Указам Прэзідэнта Беларусі па статусу БДУ. На сустрэчы таксама разглядаліся разнапланавыя праблемы: ад пытанняў падрыхтоўкі да 75-годдзя універсітэта да стварэння моцнай грамадской маладзёжнай арганізацыі.*



*Афіцыйна*

## ЗАГАД

*23 верасня 1996 г.* *№ 648 –Д*

**Аб правядзенні конкурсу "Наш універсітэт", прысвечанага 75-годдзю Белдзяржуніверсітэта, на лепшы артыкул, нарыс і мастацкі твор у газеце "Беларускі універсітэт"**

У адпаведнасці з планам мерапрыемстваў, прысвечаных 75-годдзю БДУ, загадваю:

1. Прыняць прапанову рэдакцыі газеты "Беларускі універсітэт" аб правядзенні конкурсу на лепшы артыкул з гісторыі універсітэта, лепшы нарыс на тэму "Універсітэт сёння", лепшы мастацкі твор, прысвечаны БДУ.
2. Устанавіць грашовыя ўзнагароджанні і памятныя сувеніры (майкі з эмблемай БДУ і значкі) для заахвочвання пераможцаў конкурсу

за лепшы артыкул:
I прэмія — 10 мінімальных заробкаў
II прэмія — 9 мінімальных заробкаў
III прэмія — 8 мінімальных заробкаў

за лепшы нарыс:
I прэмія — 10 мінімальных заробкаў
II прэмія — 9 мінімальных заробкаў
III прэмія — 8 мінімальных заробкаў

за лепшы мастацкі твор:
I прэмія — 10 мінімальных заробкаў
II прэмія — 9 мінімальных заробкаў
III прэмія — 8 мінімальных заробкаў

3. Зацвердзіць састаў журы конкурсу:
Старшыня — першы прарэктар П.І.Брыгадзін,
намеснік старшыні — рэдактар газеты "Беларускі універсітэт" Т.М.Казак,
члены журы — перакладчык газеты "Беларускі універсітэт" Д.В.Дзядзенка, карэспандэнт газеты "Беларускі універсітэт" К.Я.Ткачэнка.
4. Зацвердзіць Палажэнне аб конкурсе (прыкладаецца).

*Рэктар БДУ* *А.У.Казулін*

## ПАЛАЖЭННЕ

**аб конкурсе "Наш універсітэт", прысвечаным 75-годдзю Белдзяржуніверсітэта, на лепшы артыкул, нарыс і мастацкі твор у газеце "Беларускі універсітэт"**

1. Конкурс праводзіцца па трох намінацыях:
- лепшы артыкул з гісторыі універсітэта;
- лепшы нарыс на тэму "Універсітэт сёння";
- лепшы мастацкі твор, прысвечаны БДУ.

2. Матэрыялы на конкурс прадастаўляюцца ў машынапісным выглядзе або на дыскеце ў аб'ёме не больш за 3-4 друкаваныя старонкі.

3. Да конкурсу прымаюцца матэрыялы толькі студэнтаў і супрацоўнікаў БДУ.

4. Рэдакцыя пакідае за сабой права адбору матэрыялаў для друку.

5. Матэрыялы да разгляду прымаюцца да 17 кастрычніка 1996 года. Матэрыялы, прадастаўленыя пазней азначанага тэрміну, разглядацца не будуць.

6. Пераможцы конкурсу атрымаюць грашовыя ўзнагароджанні і памятныя сувеніры (майкі з эмблемай БДУ і значкі):

за лепшы артыкул:
I прэмія — 10 мінімальных заробкаў
II прэмія — 9 мінімальных заробкаў
III прэмія — 8 мінімальных заробкаў

за лепшы нарыс:
I прэмія — 10 мінімальных заробкаў
II прэмія — 9 мінімальных заробкаў
III прэмія — 8 мінімальных заробкаў

за лепшы мастацкі твор:
I прэмія — 10 мінімальных заробкаў
II прэмія — 9 мінімальных заробкаў
III прэмія — 8 мінімальных заробкаў

7. Матэрыялы на конкурс прымаюцца па адрасу:
*г.Мінск, вул.Бабруйская, 9, паверх 4, пакоі 411-412. Тэл. 20-68-27.*
*Рэдакцыя газеты "Беларускі універсітэт".*

**КАМІТЭТ БЕЛАРУСКАГА САЮЗА МОЛАДЗІ БДУ**

САЮЗ МОЛАДЗІ БЕЛАРУСІ

чакае маладых неабыякавых людзей, якія хочуць жыць весела і цікава, якія хочуць, каб іхнае студэнцкае жыццё не было нудным.

БСМ — маладзёжная грамадская арганізацыя, якая асноўнай мэтай ставіць раскрыццё творчага патэнцыялу маладых людзей, абарону і рэалізацыю іх інтарэсаў і правоў.

*Па ўсіх пытаннях звяртацца ў камітэт Беларускага саюзу моладзі БДУ:*

вул. Бабруйская, 7, пакой 416,
тэл. 268-70-98.

*Постфактум*

## Прайшоў Форум

*Форум моладзі Беларусі пад назвай "Моладзь Беларусі – за стабільнасць і прагрэс" прайшоў 20-21 верасня ў Нацыянальным прэс-цэнтры. У Мінск прыехалі дэлегаты з усіх абласцей Беларусі, а таксама прадстаўнікі маладзёжных арганізацый краіны. Праца на Форуме была арганізаваная па дзесяці секцыях: "Сацыяльныя праблемы моладзі і шляхі іх вырашэння", "Моладзь і адукацыя", "Моладзь, войска, патрыятызм", "Правапарушэнні ў маладзёжным асяроддзі", "Моладзь, культура, рэлігія, спорт", "Моладзь, занятасць, вытворчасць, прадпрымальніцтва", "Моладзь і экалогія", "Моладзь і сродкі масавай інфармацыі", "Дзяржава і маладзёжныя грамадскія арганізацыі – шляхі ўзаемадзеяння", "Міжнароднае маладзёжнае супрацоўніцтва".*

# Вялікая хартыя універсітэтаў

*Вялікая Хартыя універсітэтаў — канчатковы вынік прапановы, з якой універсітэт Балоні звярнуўся ў 1986 годзе да найстарэйшых еўрапейскіх універсітэтаў. Гэтая ідэя была прынятая з энтузіязмам.*

*У час сустрэчы ў Балоньі ў чэрвені 1987 года дэлегаты 80 еўрапейскіх універсітэтаў абралі 8 прадстаўнікоў, сярод якіх рэктары універсітэтаў Балоньі, Парыжа, Барселоны і г.д.*

*Дакумент, падрыхтаваны ў студзені 1988 года ў Барселоне, быў падпісаны ўсімі рэктарамі, якія прысутнічалі ў Балоньі на святкаванні 900-годдзя універсітэта.*

*Мэты дакумента — прапаганда безумоўных каштоўнасцяў універсітэцкіх традыцыяў і спрыянне шчыльным повязям паміж універсітэтамі Еўропы. Тэкст Вялікай Хартыі універсітэтаў прапаноўваўся на ўсіх мовах краінаў, універсітэты якіх падпісаліся пад дакументам.*

*Ад Белдзяржуніверсітэта на сустрэчы прысутнічаў А.І.Лесніковіч.*

## Прэамбула

Ніжэйпадпісаныя рэктары еўрапейскіх універсітэтаў, якія сабраліся ў Балоньі з нагоды дзевятага стагоддзя найстарэйшага з іх, за чатыры гады да канчатковага скасавання межаў паміж краінамі супольнасці, маючы на ўвазе перспектыву пашырэння супрацоўніцтва між усімі еўрапейскімі народамі, пераканаyныя ў тым, што народы і дзяржавы мусяць сёння як ніколі раней усвядоміць ролю, якую будуць закліканыя адыграць універсітэты ў грамадстве, што змяняецца і адкрываецца ў міжнародным плане, выражаюць упэўненасць у тым, што:

1) будучыня чалавецтва на парозе трэцяга тысячагоддзя ў вялікай ступені залежыць ад культурнага і навукова-тэхнічнага развіцця, што адбываецца ў тых цэнтрах культуры, ведаў, даследаванняў, якімі з'яўляюцца гэтыя універсітэты;

2) задача па распаўсюджванню ведаў сярод новых пакаленняў, якую мусяць узяць на сябе універсітэты, азначае сёння, што яны абавязаныя звяртацца да ўсяго грамадства, чыя культурная, сацыяльная і эканамічная будучыня патрабуе цяпер асаблівага, значнага і пастаяннага ўкладу ў справу выхавання;

3) універсітэты мусяць забяспечыць будучым пакаленням адукацыю і выхаванне, што спрыяла б ашчаднаму стаўленню да вялікай гармоніі навакольнага асяроддзя і самога жыцця.

Таму я абвяшчаю перад дзяржавамі і народамі асноўныя прынцыпы, якімі адгэтуль і надалей мусяць кіравацца універсітэты.

## Асноўныя прынцыпы

1. Універсітэт дзейнічае ўнутры грамадстваў з рознай арганізацыяй, якая з'яўляецца наступствам розных геаграфічных і гістарычных умоў, у ўяўляе сабой аўтаномны інстытут, які крытычна асэнсоўвае і распаўсюджвае культуру шляхам даследавання і выкладання.

Каб адпавядаць патрабаванням сучаснага свету, у сваёй даследчай і выкладчыцкай дзейнасці ён мусіць мець маральную і навуковую незалежнасць ад палітычнай і эканамічнай улады.

2. Навучальны працэс ва універсітэтах павінен быць непадзельны з даследчай дзейнасцю для таго, каб выкладанне адначасова было на ўзроўні, адпаведным эвалюцыі як патрэбаў грамадства, так і патрабаванняў, якія ставяцца да навуковых ведаў.

3. Паколькі свабода выкладання, даследаванняў і навучання — асноўны прынцып жыцця універсітэтаў, то як грамадская ўлада, так і універсітэты мусяць у рамках сваёй кампетэнцыі гарантаваць гэта і спрыяць захаванню гэтага прыярытэтнага патрабавання.

Адрынаючы нецярпімасць і будучы пастаянна адкрытым для дыялогу, універсітэт становіцца, значыць, найбольш прымальным месцам сустрэчы паміж выкладчыкамі, якія валодаюць здольнасцю перадаваць веды і сродкамі іх паглыблення праз даследаванні і пошукі новага, і студэнтамі, якія маюць права, жаданне і здольнасць узбагачаць сябе гэтымі ведамі.

4. Будучы захавальнікам традыцыяў еўрапейскага гуманізму, але ў пастаянным імкненні да дасягнення універсальных ведаў, універсітэт, выконваючы сваю функцыю, пераадольвае палітычныя і геаграфічныя межы і сцвярджае пільную неабходнасць узаемнага пазнання і ўзаемадзеяння розных культураў.

## Спосабы

Рэалізацыя гэтых мэтаў у святле вышэйпададзеных прынцыпаў патрабуе наяўнасці эфектыўных сродкаў, якія належным чынам адпавядаюць цяперашняй сітуацыі.

1. Для забеспячэння свабоды даследаванняў і выкладання ўсім членам універсітэцкай супольнасці мусяць прадастаўляцца неабходныя сродкі для дасягнення гэтай мэты.

2. Падбор прафесарскага саставу і вызначэнне яго статусу мусіць праходзіць у адпаведнасці з прынцыпам непадзельнасці даследчай дзейнасці з выкладчыцкай.

3. Кожны універсітэт, з улікам спецыфікі акалічнасцяў, абавязаны гарантаваць свaім студэнтам захаванне свабодаў і неабходных умоваў для дасягнення імі іхных культурных і адукацыйных мэтаў.

4. Універсітэты — асабліва еўрапейскія — разглядаюць узаемны абмен інфармацыяй і дакументацыяй, а таксама павелічэнне сумесных навуковых праектаў як асноўныя сродкі пастаяннага прагрэсу ведаў. У гэтых мэтах, як гэта адбывалася пры іх зараджэнні, яны стымулююць мабільнасць выкладчыкаў і студэнтаў і лічаць, што агульная палітыка ў пытанні раўназначнасці статусу, званняў і экзаменаў, хаця і пры паважлівым стаўленні да нацыянальных дыпломаў, і ў прадастаўленні стыпендыяў складае асноўны сродак, які гарантуе выкананне іх сённяшняй місіі.

Ніжэйпадпісаныя рэктары ад імя сваіх універсітэтаў бяруць на сябе абавязак прадпрыняць усё ад іх залежнае для таго, каб кожная дзяржава і зацікаўленыя наднацыянальныя арганізацыі маглі б яшчэ больш абапірацца на палажэнні гэтай Хартыі, якая з'яўляецца аднадушным выражэннем аўтаномнай волі кожнага універсітэта.

<u>Актуальна</u>

# "Зараз мы выконваем, у першую чаргу, задачы абароны студентаў"

*Студэнты сёння, як правіла, не ўяўляюць, што такое прафсаюзная арганізацыя. Першакурснікі, якія прыходзяць ва універсітэт са школьнай лавы, ведаюць пра яе толькі па размовах. Таму першае, да чаго імкнецца студэнцкі прафсаюз,— пазнаёміць студэнтаў з задачамі і функцыямі сваёй арганізацыі. Пра гэта сёння распавядае старшыня прафкама студэнтаў Ніна Міхайлаўна ТУРОМША:*

— Хочацца адзначыць, што калі раней прафсаюзная арганізацыя выконвала размеркавальную функцыю (размяркоўвала машыны, пуцёўкі, кватэры), дык зараз мы выконваем, у першую чаргу, задачы абароны студэнтаў, якія прыходзяць да нас з просьбай дапамогі. І мы дапамагаем.

*— Па якіх асноўных кірунках вядзецца праца ў прафсаюзных арганізацыях?*

— Мы ўвогуле карыстаемся старым статутам ВЦСПС. Гэта арганізацыйна-масавая работа, якая ўключае ў сябе прыём у члены прафсаюза, правядзенне сходаў і г.д. Другі накірунак — жыллёва-бытавы: усё звязанае са студэнцкімі інтэрнатамі, побыт студэнтаў, паляпшэнне жыллёвых умоваў і інш. Культурна-масавы кірунак уключае арганізацыю адпачынку на факультэтах, у інтэрнатах. Навучальна-выхаваўчы накірунак прадугледжвае кантроль за навучальным працэсам, падрыхтоўкай аўдыторыяў, колькасцю экзаменаў у сесіі, паспяховасцю студэнтаў, стыпендыяй... Асаблівa зараз, калі выйшла новая пастанова і прафсаюз удзяляе больш увагі ў прызначэнні стыпендыі. Таксама мы кантралюем пункты грамадскага харчавання: правяраем і курыруем студэнцкія сталовыя. І, нарэшце, спартыўна-аздараўленчы кірунак: арганізацыя спартыўных мерапрыемстваў, а таксама адпачынку ўлетку і ўзімку.

*— Наколькі шматлікі цяперашні прафсаюз?*

— Раней членамі прафсаюза былі 100% студэнтаў. Цяпер мы ў параўнанні з іншымі ВНУ горада — на першым месцы па колькасці студэнтаў, якія ўступілі ў прафсаюз: 95% ад агульнай колькасці.

*— З якімі праблемамі найбольш часта даводзіцца сутыкацца?*

— Праблемы разнастайныя. Напрыклад, незасяленне ў інтэрнат па розных прычынах. Высвятляем — чаму, як, вырашаем праблему.

Найпершая праблема на сёння — недахоп месцаў у інтэрнатах для студэнтаў-першакурснікаў.

Яшчэ адна праблема ў тым, што на тэрыторыі універсітэта няма сваёй паліклінікі, а толькі фельчарскі пункт. Хаця б працоўны кабінет на тэрыторыі БДУ мусіць існаваць, каб студэнты затрачвалі мінімум часу на лячэнне.

Бывае няывыплата дапамогі па доглядy за дзіцём, прыходзяць роспачныя ад фінансавых цяжкасцяў студэнты, просяць дапамагчы студэнты, якія маюць праблемы са здароўем (ім мы выдзяляем пуцёўкі ў прафілакторый).

*— Дарэчы, якое зараз становішча з прафілакторыем?*

— На жаль, пры цяперашняй сітуацыі ў нашай краіне датацыі на ўтрыманне прафілакторыя мы атрымліваем нерэгулярна. Значыць, і прафілакторый не можа дзейнічаць пастаянна. Зараз ужо верасень, але прафілакторый папярэдне закрыты. Мы падрыхтавалі ліст на імя рэктара з просьбай выдзеліць 50 млн. рублёў для арганізацыі пачатку заезду і такі ж ліст у Рэспубліканскае ўпраўленне фонду здароўя. А пакуль што мы арганізавалі заезд студэнтаў толькі на лячэнне, без харчавання.

*— Аднак здаровае большасці студэнтаў не вымагае знаходжання ў прафілакторыі, а добра адпачыць хочацца і ім. Што можа прапанаваць прафсаюз?*

— Сёлета зімой студэнты адпачывалі ў доме адпачынку "Нарач", 30 чалавек ездзілі на экскурсію ў Санкт-Пецярбург і столькі ж — у Кіеў. Што датычыцца летняга адпачынку. у нас было каля 50 пуцёвак у той самы дом адпачынку "Нарач". Да таго ж існуе такая форма адпачынку, як летнія працоўныя лагеры ў Крыме.

*— Якую дапамогу аказвае прафсаюз студэнтам-сіротам?*

— На гэтае пытанне я хачу звярнуць асаблівую ўвагу. Бывалі выпадкі, калі студэнты, якім паводле закону належала ўтрымлівацца на дзяржаўным забеспячэнні, даведваліся пра гэта праз два ці нават тры гады. Таму прафсаюзны камітэт абяцае студэнтам, у якіх няма бацькоў: мы дапаможам разабрацца ў сітуацыі і атрымаць належную дзяржаўную дапамогу.

*Сёлета галіновы прафсаюз, у які ўваходзіць і прафкам студэнтаў, адзначыў сваё 75-годдзе, як і універсітэт. Віншуем!*

***Кацярына Ткачэнка***

<u>ДАІ паведамляе</u>

# Будзьце пільнымі

Пачаўся новы навучальны год. Ён абнавіў шэрагі студэнтаў Белдзяржуніверсітэта. Мы за іх вельмі радыя. Але ёсць і занепакоенасць: як засвоілі прыезджыя першакурснікі Правілы дарожнага руху, наколькі хутка яны прызвычаяцца да жыцця вялікага горада з бесперапынным плынню транспартных сродкаў, якіх становіцца ўсё болей?

Мінулы навучальны год для службы ДАІ быў неспакойным: з боку супрацоўнікаў і студэнтаў БДУ былі грубыя парушэнні ПДР — кіраванне транспартам у нецвярозым стане, перавышэнне ўстаноўленай хуткасці вадзіцелем, кіраванне транспартным сродкам без адпаведных дакументаў, пераход вуліцы ў не адведзеным для гэтага месцы (што прывяло да трагічнага выніку — гібелі дваццацігадовага студэнта).

*Работнікі Маскоўскага ДАІ заклікаюць супрацоўнікаў і студэнтаў быць дысцыплінаванымі ўдзельнікамі дарожнага руху!*

***Дзяржаўтаінспектар Маскоўскага ДАІ А.Кудраўцаў***

*Конкурсы*

# Жыціе Кубка “Несцеркі-96”,

## *або Хаджэнне студэнткі факультэта журналістыкі да інтэлектуалаў Беларусі*

### *I частка*

Хай будзе блаславёнай тая галава, дзе нарадзілася думка правесці на Беларусі міжнародны турнір па інтэлектуальных гульнях “Несцерка-95”, які з Божай дапамогай прайшоў 18-19 сакавіка 1995 года.

Хай будзе блаславёны той розум, які вырашыў зрабіць гэты турнір пастаянным.

Хай будуць блаславёныя тыя людзі, якія не спужаліся эканамічных цяжкасцяў і падарылі беларускім інтэлектуалам свята.

І вось мне, маленечкай студэнтцы факультэта журналістыкі, якая яшчэ поўнасцю не спасцігнула журналісцкую навуку, давядзецца апісваць гэтыя падзеі.

Ёсць на свеце беларуская ліга інтэлектуальных гульняў, ад якой і нарадзілася гэтае шчаснае дзіця. Самым галоўным на турніры (ва ўсялякім разе ён спрабаваў такім выглядаць) быў арганізатар і вядучы Яўген Зайцаў: “Калі турнір “Несцерка-95” атрымаўся чыста беларускім, бо замежныя каманды проста не прыехалі, то зараз у нас у гасцях дзве адэскія і адна маскоўская каманды. Адбор на турнір праводзіўся наступным чынам. У кожным абласным цэнтры, і не толькі ў іх, ёсць гарадскія, абласныя лігі, якія праводзяць рэгулярныя чэмпіянаты, дзе паводле квоты праходзіў адбор. А замежныя каманды запрашаліся па асабістых кантактах”.

Турнір выконваў дзве функцыі. Па-першае, праводзіўся чэмпіянат Беларусі па гульні “Што? Дзе? Калі?”. А па-другое, гэта быў адбор камандаў для ўдзелу ў праграме Беларускага тэлебачання “Рызыка-версія”.

Баі праходзілі чатыры дні: 19 верасня — “Што? Дзе? Калі?”, 20 — “Брэйн-рынг”, а 21 і 22 — запіс на тэлебачанні.

Турнір адбываўся пры дапамозе Камітэта па справах моладзі. Дзякуючы яму арганізатары змаглі зняць даволі танную гасцініцу БДПА, дзе жылі прыезджыя каманды. Таксама хочацца адзначыць наш родны БДУ. Усім вядома, што універсітэту спаўняецца 75 год. З гэтай нагоды турнір “Несцерка-96” быў уключаны ў чараду святаў. А гэта значыць, што для беларускіх інтэлектуалаў быў бясплатна прадастаўлены 4-ы паверх галоўнага корпуса.

Але хопіць ужо арганізацыйных пытанняў... Пойдзем хутчэй у залу, дзе толькі-толькі пачалася размінка. Дакладней кажучы, размінка гэта была толькі для камандаў, а для гледачоў — самая сапраўдная гульня. Яўген Зайцаў прапанаваў 10 пытанняў з некалькімі варыянтамі адказаў на кожнае, а балельшчыкі адзначалі правільныя, на іх погляд, адказы. Трэба заўважыць, што пытанні былі на любы густ: ад “Чым лячылі калісьці раны (соллю, попелам ці, прабачце, мачой)?” да “Калі адзін са знаёмых вядучага пахваліўся сябрам новым дыпламатам з кодам, што яны ў першую чаргу правяралі (код, шукалі другое дно, ці паспрабавалі запхнуць бутэльку гарэлкі)?”. Асабіста мне спадабалася пытанне пра Бісмарка: каго ён хацеў бы бачыць раніцай у ролі памочніка пры абуванні ім хатніх тапачак (жонку, прыгажуню-служанку ці каго-небудзь з гасцей, пажадана — аўстрыйскага пасла)? Два найбольш разумных балельшчыкі атрымалі права выстаўляць сваю каманду ў суперфінале, мінуючы кваліфікацыйныя і паўфінальныя баі.

Кваліфікацыя мусіла падзяліць каманды на лігі: вышэйшую (20 лепшых) і першую (усе астатнія). Пасля паўфіналаў засталіся сямёра лепшых з вышэйшай і пераможца першай лігі — гэта і былі сапернікі каманды балельшчыкаў у суперфінале.

Загадзя хачу папярэдзіць. Усяго камандаў-удзельніцаў 59. Каб азнаёміць з гульнёй кожнай, трэба каля батальёна журналістаў і колькасць паперы, якой хапіла б Льву Талстому, каб напісаць “Вайну і мір” і “Ганну Карэніну”. Таму я больш увагі звярну на каманды, якія гуляюць за БДУ: БДУ, “Паняверкі” і “Няміга”. А ў перапынках паміж турамі ( а яны будуць працяглымі, можаце не сумнявацца: адзін з нашых капітанаў паабяцаў, што гульня будзе працягвацца да “белых венікаў”) я пазнаёмлю вас з некаторымі іншымі камандамі або проста цікавымі людзьмі, паспрабую дапамагчы акунуцца ў жыццё “Брэйн-рынга”.

Кваліфікацыя складаецца з 24 пытанняў, складаных і не вельмі. Цешыць тое, што каманды не баяліся жартаваць, калі не ведалі правільнага адказу, часам нават забываючы пра прыз “Кіслыя журавіны”. (Вось прыклад аднаго з пытанняў: “Амерыканцы параўноўваюць гэта з ананасам, нашы — з лімонам. А для чаго гэта?” Канешне, большасць здагадалася — каб штосьці ўзарваць, але знайшліся і тыя, хто палічыў магчымым паспрабаваць з “гэтым”, з гранатай-”лімонкай”, гарбаты.)

Вынікамі кваліфікацыі маглі быць задаволеныя толькі “Паняверкі”: яны – пятыя. БДУ — на 23 месцы, а “Няміга” — толькі на 36-м.

Цяпер давайце знаёміцца з нашымі героямі. Каманда БДУ утварылася на базе выпускнікоў сярэдняй школы № 51. Капітану Максіму Ярохаву падабаюцца жанчыны мексіканскага тыпу і BMW-850. Ён хоча прадацца венесуэльскай разведцы за вялікую суму, на якую і купіць свой любімы BMW. Аляксей Вінаградаў, Дзіма Старухін, Федзя Загорын, Наташа Карасцік, Алёша Аксенчанка складаюць каманду. Іх найвялікшае дасягненне — чэмпіёнства турніру “Несцерка-95” па “Брэйн-рынгу”.

Каманду “Паняверкі” знайсці было не складана: дужыя хлопцы ў цёмна-сініх кашулях з “сапліўчыкамі” (чорнымі хусткамі) на шыях выдзяляліся сярод усіх. А вось распытаць капітана Яўгена Скібскага. што азначае назва каманды, не ўдалося ні мне, ні каму-небудзь іншаму. Праўда, з гісторыяй узнікнення мне пашчасціла больш:

— Заснавальнікам каманды лічыцца Сяргей Казачэнка, студэнт БДПА, які прыкладна год таму разам са сваімі сябрамі з гістарычнага факультэта БДУ і стварыў “Паняверкі”. Потым Сяргей пайшоў, а мы засталіся. Пра назву і не пытайце — не скажу. Гэта сакрэт. Найвялікшае наша дасягненне — другое месца на адкрытым чэмпіянаце БДПА.

— ***Жэня, раскажыце пра свае трэніроўкі, калі гэта не сакрэтная інфармацыя.***

— Вядома ж, не. Трэніроўкі бываюць двух кшталтаў. Першы — калі трэніруецца адна каманда. На іх вызначаецца рассадка ігракоў, іх функцыянальныя абавязкі. Наогул, існуе чатыры катэгорыі функцыяў: капітан (канцэнтратар ідэяў), генератар ідэяў, эрудыт і душыцель (крытык). Другі від трэніровак — гульнёвыя. Вядучы.задае пытанні, а каманды адказваюць. Тут можна гуляць як па правілах “Брэйн-рынга”, так і па правілах “Што? Дзе? Калі?”.

“Няміга” узнікла толькі 10 верасня, але гэта не азначае, што іграki каманды не маюць ніякага вопыту: капітан Аляксандр Гронскі, Аляксандр Кісялёў і Наталля Арлова ў свой час гулялі запаснымі ігракамі “Паняверак”. Калі ім надакучыла быць другімі нумарамі, яны сабралі сваю каманду, запрасіўшы Дзіму Белікава, Алега Гардзіенку і Іру Алюніну.

Да абвяшчэння вынікаў паўфіналу я паспела задаць некалькі пытанняў капітану каманды “Пратэй” (БДПА) Віталю Куланіну:



— *Што азначае “Пратэй”?*

— Пратэі — гэта мудрыя падземныя яшчары, аднаго з якіх мы сагнулі ў пытальнік і пасадзілі ў кола.

— ***Ведаю, што хоць гуляеце вы даволі даўно, але, як і многія каманды, мелі праблемы з саставам перад гэтым турнірам.***

— Гэта так. З каманды, якая з’явілася ў снежні 1995 года, засталося чацвёра. Яшчэ дваіх чалавек знайшлі толькі-толькі. Але найвялікшыя праблемы былі з капітанам. У мяне няма вялікага жадання ўзначальваць каманду, бо я хачу сам штосьці прыдумваць, а не толькі слухаць і адбіраць версіі іншых. Але ж трэба выручаць каманду.

Паўфінал скончыўся добра толькі для “Нямігі”, якая ставіла сабе задачу быць дзесьці ў раёне трыццатага месца, і заняла 27-е. Каманда БДУ згубіла некалькі месцаў, а хлопцы з “Паняверак”, стаміўшыся, адкаціліся з пятага месца на дваццаць трэцяе.

Пераможцы паўфіналу:

1. “Хатні бусел” (каманда Клімовіча) — 12 балаў;
2. “Джокер” (Магілёў);
3. ЛСД (Магілёў);
4. “Брэйн-Брэкерс” (Віцебск) — пераможца першай лігі;
5. “Зялёны змій” (Гомель);
6. “Злавесныя сухары” (Гомель);
7. “Рада” (Мінск);
8. Зборная Віцебска.

Так атрымалася, што зборная Віцебска спазнілася на суперфінал і не была дапушчаная да турніру. Пераможцам стала каманда “Злавесныя сухары” з Гомеля.

*(Працяг у наступным нумары)*

***Вольга Каздзерка***

---

*Весткі з бібліятэкі*

# *ПАРАДА РАССЕЯНЫМ ЧЫТАЧАМ: ГРОШЫ БЯРЫЦЕ З САБОЙ*

Разам з БДУ 30 кастрычніка адзначыць сваё 50-годдзе універсітэцкая бібліятэка. За час свайго існавання яна шмат чаго бачыла і шмат што мяняла. Першыя правілы карыстання прадугледжвалі выдачу кніг настаўнікам усяго на два тыдні (і гэта вырашылі самі выкладчыкі). Да таго ж, у першыя гады існаваў студэнцкі савет. У цяжкі час ён талакой купляў падручнікі. Цяпер можна толькі здзіўляцца такой высокай самасвядомасці. Неразлік з бібліятэкай цяпер — звычайная справа. Таму наша ўстанова хоча ўзяць прыклад з маскоўскай: не вярнуў падручнік у прызначаны тэрмін — плаці грошы. Чым больш трымаеш, тым больш плоціш. Гэтыя штрафныя санкцыі шмат каго працвярозяць.

Чытачам бібліятэкі будзе карысна памятаць, што за згубленую кнігу яны заплоцяць не рубель і не два, як яна каштавала раней. З улікам інфляцыйнага каэфіцыенту сума аплаты складзе ад 70 да 100 тысяч. А даведнікі — і таго болей (ад 200 да 500 тысяч).

***Валерыя Аўсянік***

---

# ЗАПРАШАЕМ У ЧЫТАЛКУ!

У кастрычніку 1993 года ў бібліятэцы Белдзяржуніверсітэта была адкрыта чытальная зала замежнай літаратуры (ЧЗЗЛ). На сённяшні дзень яе фонд складае больш за 10 тысяч экземпляраў, сярод якіх каля 3 тысяч кніг і звыш 7 тысяч часопісаў. Гэта ў асноўным часопісы, якія на працягу двух гадоў нам пастаўляе Амерыканская Асацыяцыя па Прагрэсу ў Навуцы, фонд Сораса, а таксама часопісы, атрыманыя па замежнаму кнігаабмену. Акрамя таго, у бібліятэцы знаходзяцца рэфератыўныя часопісы канца XIX-пачатку XX стагоддзя, якіх няма ні ў адной бібліятэцы рэспублікі.

У 1993 годзе Міністэрства адукацыі і навукі Германіі выдзеліла 200 тысяч марак для заказу літаратуры па самых разнастайных галінах ведаў. У канцы 1994 пачатку 1995 года



ЧЗЗЛ атрымала вялікую колькасць кніг па матэматыцы, фізіцы, хіміі, біялогіі, вылічальнай тэхніцы. Асабліва многа было атрымана кніг па мовазнаўству на нямецкай мове (амаль усе з аўдыя- і відэакасетамі). Нядаўна чытальная зала атрымала кнігі па эканоміцы, псіхалогіі, сацыялогіі, якія прыбылі да нас з далёкага замежжа.

Да паслуг чытачоў знаходзяцца ў чытальнай зале відэаплеер, спадарожнікавае тэлебачанне з інфармацыйнай праграмай перадач на нямецкай, англійскай, французскай, італьянскай мовах.

Акрамя таго, чытачы маюць магчымасць азнаёміцца са мноствам каштоўных даведачных выданняў, экцыклапедый, слоўнікаў, сярод якіх сусветна вядомая энцыклапедыя на англійскай мове Britannica, энцыклапедыі на нямецкай, іспанскай, польскай, балгарскай, чэшскай мовах.

Такім чынам, у чытальнай зале ёсць усе магчымасці для аваладвання замежнай мовай, для азнаямлення з найноўшымі дасягненнямі навукі і тэхнікі. Сардэчна запрашаем усіх!

***Галоўны бібліятэкар чытальнай залы А.А.Лукашэвіч***

# Тэлефон выратавання...

## альбо Дыпломная работа для "беднага" студэнта

Ужо не першы год напярэдадні ўступных экзаменаў рэкламныя газеты, як і ліхтарныя слупы, стракацяць аб'явамі, прапануючы дапамогу пры падрыхтоўцы да экзаменаў. Акрамя гэтага студэнтам настойліва прапануюць рашэнні кантрольных, гатовыя рэфераты і дыпломныя працы.



Як вядома, матэрыяльнае становішча настаўнікаў прымушае чакаць лепшага. Вось і "вырашаюць студэнцкія праблемы" яны ў вольны ад працы час. Гадзіна кансультацыі, напрыклад, абыходзіцца ў сярэднім у два долары. Відаць, такая таннасць — знак ухвалы адважным. Што датычыцца дыпломных, цэны значна вышэй і абмяркоўваюцца адзін на адзін, усё залежыць ад складанасці працы.

Аднак сапраўдных прафесіяналаў усё больш выцясняюць свежаспечаныя выпускнікі. Пасля заканчэння ВНУ шмат каму досыць цяжка (ці лянота?) адшукаць добрую працу. А дапамагчы студэнту — справа высакародная. І прыбытковая, калі рашыць бедаку ўсе задачы і курсавыя працы. Хто, як не былыя студэнты, якія добра ведаюць складанасць навучання, могуць дапамагчы сваім братам, укараняючы дамашнюю вытворчасць розных шпаргалак. Хаця для экзаменаў гэта даволі танны і прымітыўны сродак. Апошні ўскрык тэхнікі (ці, можа, ёсць нешта звышновае?) — радыётэлефон. "Ён такі малы, што яго можна "забыць" дзе хочаш. Сілкуецца ад звычайнай батарэйкі і можа беспярэпынна працаваць на працягу месяца. Дастаткова мець радыёпрыёмнік з дыяпазонам ультракароткіх хваляў (FM), і здаць экзамены не ўяўляе ніякай складанасці." Так кажа цудам ацалэлая аб'ява на сцэнцы Політэхнічнай акадэміі. Што і казаць, дзякуй тэхнічнаму прагрэсу!

Можна без цяжкасцей, калі дазваляюць сродкі, "рашыць" складаныя задачы, знайсці хітрыкі на экзаменах і атрымаць дыплом выдатніка. Але славуты выраз "Веды — сіла", які некалі выклікаў аскому, — не выцвілы лозунг. У свой час гэта зразумелі тыя, хто працуе з чужымі "праблемамі", зарабляючы сабе на жыццё.

*Аляксей Максюкоў*

---

*Тусоўка*

# "Не слухайце нікога і пішыце так, як вы гэта разумееце"

Задаўшыся мэтай вы светліць, ці захаваўся такі спецыфічны від крытыкі, як крытыка музычная, а калі захаваўся, то наколькі ён дзейсны, мы пачалі ліхаманкава гартаць часопісы і газеты, а таксама — на ўсялякі выпадак — слухаць радыё. Высветлілася, што з новай музычнай крытыкай усё добра. Просім засяродзіць увагу на слове "новай". Калі ў полі зроку ўсёй музычнай крытыкі знаходзіцца музычны працэс, дык новая займаецца часткай яго — музыкай сучаснай, г.зн. пераважна не класічнай.

Прозвішчы пад музычнакрытычнымі артыкуламі разнастайнасцю не вызначаюцца. Праз даволі сціслы прамежак часу мы пераканаліся, што крытыка даследаванага намі накірунку трымаецца на "двух кітах" — Дзмітрыі Падбярэзскім і Максе Івашыне.

Па-першае, прадметам нашай цікаўнасці былі шляхі, якімі маладыя людзі прыходзяць у лагер крытыкі. Высветлілася, што яны такія ж разнастайныя, як і нечаканыя. Дзмітрый Падбярэзскі вучыўся на беларускім аддзяленні філфака БДУ, быў настаўнікам у сельскай школе. Невядома, які вецер занёс яго на БТ, дзе ў 70-80-х гадах ён вёў "ідэалагічна чужую" праграму "Тэледыскатэка", у якой паказваць відэазапісы заходніх рок-гуртоў можна было, толькі папярэдне расказаўшы, якія яны дрэнныя. Чым аўтары перадачы і займаліся пасляхова.

Макс Івашын ішоў іншым шляхам:

— Прафесійная адукацыя? Войска. Пасля яго спакусілі ў журналістыку. Ёсць і вышэйшая адукацыя, якой я абавязаны педінстытуту. Пасля навучання ў ім мне надалі званне настаўніка гісторыі і англійскай мовы. Час тады быў добры. Праводзілася шмат канцэртаў — да Мінска дакацілася першая хваля рок-н-рола, расійскай свабоды. А ідэю першага артыкула мне падала мама, яна ў мяне прафесійны музыкант. З гэтага ўсё і пачалося. Пісаў для "Крыніцы", а потым стаў усё часцей звяртацца ў "Знамя юности" і перatварыўся ў яе пастаяннага аўтара. Пісаў рэцэнзіі на касеты беларускіх выканаўцаў і, здаецца, быў першым, хто гэтым займаўся.

Так, невядомыя шляхі крытыкаў. Але любая крытыка, на нашую думку, мае на ўвазе працы, творчасці.

Пункт погляду Дзмітрыя Падбярэзскага больш дэмакратычны. Ён лічыць, што музычная адукацыя крытыку проста не перашкодзіць і на сённяшні дзень крытыка немагчымая без публіцыстыкі. "Голая" музычная інфармацыя — гэта спосаб пісаць пра музыку, не сказаўшы пра яе ні слова. Апісваць музыку — складаная задача, і дзеля яе вырашэння публіцыстыка неабходная. "Журналіст павінен стварыць "чацвёртую частку" сімфоніі са словаў. Хай яны будуць простыя, не выкшталцоныя, але выяўляюць пачуцці, настрой таго, што грала". Макс Івашын працягвае калі ляную ся вынаходзіць што-небудзь. Уявіць, напрыклад, хард-рок — тут усё зразумела, прафесійна, прыгожа, але настолькі адпрасаванае ўжо, раскатанае — узлётная паласа. І яна вядзе да зорак. Хаця гэтая музыка ўжо даўно другасная, пра гэта варта пісаць, бо ў нас — і гэта дасягненне. Вялікае мноства дылетантаў з прэтэнзіяй на інтэлект, арыгінальнасць. Таму пажадана ўказаць людзям, якія не надта добра разбіраюцца, на тое, што кепска, а што добра. Галоўнае — гэта спроба зразумець тое, што задумаў выканаўца, максімальна шырокі ахоп пазіцыяў. Іншымі словамі, каб гэта было дасканалае веданне аўтарам прадмета яго ных развагаў. Таму нас усхвалявала праблема музычнай адукацыі крытыка.

Макс Івашын у гэтым пытанні прытрымліваецца заходняга (паводле яго нага выразу) гледзішча: веданне крытыкам прадмета яго даследаванняў — абавязковае. Ён супакоіў нас, што музычная адукацыя ў яго ёсць. Праўда, ён дапускае, што брак музычнага прафесіяналізму можа быць кампенсаваны журналісцкім талентам і працалюбствам. Творчасць ідэальнага крытыка, паводле Макса Івашына, трымаецца на таленце, думку Дзмітрыя Падбярэзскага: "Крытыку неабходна мець культуру музычнага мыслення".

Аднак нам, аўтарам гэтага артыкула, хацелася высветліць, у чым усё ж такі заключаецца мэта крытыкі, што штурхае кампетэнтных у музыцы журналістаў брацца за пяро.

Шчыраванне Івашына:

— Мэта крытыкі — "культуру ў масы", хаця ў працэсе пісання нечага пра нешта гэта часам знікае, а зрэдку і ў працэсе слухання некага гэта забываецца, проста хочацца раваць і мятаць — ні пра якую культуру гаворка не ідзе. Я не здымаю віны з сябе ў выпадку, суаднясенне поглядаў артыста, прадзюсера, дызайнера — гаспадароў гэтай працы, а таксама спажыўца. Спектр атрымліваецца шырокі. І ва ўсім варта прытрымлівацца этычных крытэрыяў.

Дзмітрый Падбярэзскі выказаўся сцісла:

— Я выказваю сваё ўражанне. Людзі, не слухайце нікога і пішыце так, як вы гэта разумееце!

Слухаем парады!

*Ю.Васілішына*
*Дз.Міхайловіч*

---

*Сакрэт фірмы*

З 18 недзяржаўных ВНУ па розных спецыяльнасцях акрэдытавана пакуль што толькі 6, якія і маюць права выдаваць сваім выпускнікам дыпломы дзяржаўнага ўзору. Усе яны ў той ці іншай ступені займаюцца навучаннем будучых эканамістаў, юрыстаў і менеджэраў.

Першы ў гэтым спісе — недзяржаўны Інстытут сучасных ведаў, у якім атрымліваюць дыплом дзяржаўнага ўзору па шасці спецыяльнасцях. Студэнты Інстытута кіравання, недзяржаўнага Інстытута кіравання і прадпрымальніцтва, Міжнароднага інстытута працоўных і сацыяльных адносінаў, Беларускага недзяржаўнага інстытута правазнаўства і Камерцыйнага інстытута прадпрымальніцкай дзейнасці таксама могуць разлічваць на запаветны дыплом устаноўленага дзяржаўнага ўзору.

Праўда, выбар акрэдытаваных спецыяльнасцяў у гэтых вышэйшых навучальных установах пакуль што абмежаваны.

Аднак неабходна памятаць, што наяўнасць дакумента-сертыфіката па той ці іншай спецыяльнасці яшчэ не азначае, што новая ВНУ поўнасцю зацвердзіла сябе ў сістэме вышэйшай адукацыі Рэспублікі. Вышэйшыя навучальныя ўстановы, якія не адпавядаюць патрэбам студэнтаў, страчваюць патэнцыяльных абітурыентаў, а значыць, з цягам часу могуць спыніць сваё існаванне. Выжывуць толькі тыя камерцыйныя ВНУ, дзе забяспечваецца найлепшы выбар спецыяльнасцяў і высокі ўзровень навучання.

---

## КРОССВОРД



**По горизонтали:** 5. Группа должностных лиц, образующих административный, совещательный или распорядительный орган. 6. Проверка и исправление текста при подготовке его к печати. 8. Регулярное денежное пособие, выдаваемое учащимся в учебных заведениях. 9. Комплект типографских литер для набора, воспроизводящий какой-либо алфавит, а также цифры и знаки. 10. Нормативный акт, принятый высшим органом государственной власти. 11. Собрание документов по какому-нибудь делу. 13. Главная героиня повестей-сказок Л.Кэрролла. 15. Создатель произведения. 17. Нижняя часть газетной страницы, а также статья, занимающая эту часть страницы. 18. Суждение, выражающее оценку чего-либо. 22. Населённый пункт определённой категории. 24. Плетёная обувь студента М.В.Ломоносова. 25. Установленная расценка товаров или норма оплаты чего-нибудь. 26. Популярная песня О.Газманова. 27. Приём, способ, метод работы. 28. Творческая профессия, связанная с литературно-публицистической деятельностью. 29. Национальность. 30. Промежуток, перерыв, расстояние между чем-либо.

**По вертикали:** 1. Прибор, предназначенный для замыкания и размыкания электрической цепи, действие которого основано на фотоэффекте. 2. Составление страниц (полос) газеты, журнала, книги определённого размера из набраных строк, заголовков, иллюстраций и т.п. 3. Событие в развитии фабулы, определяющее начало конфликта между действующими лицами. 4. Разновидность магнитофона, устройство для записи речи с целью, например, последующего печатания её текста с помощью пишущей машины. 7. Период экзаменов после определённого этапа обучения. 11. Руководство факультета во главе с деканом. 12. Наименьшее из натуральных чисел. 14. Одна из основных единиц языка, служащая для именования предметов, лиц, процессов, свойств. 16. Организованная вооружённая борьба между государствами, классами, нациями. 19. Краткая запись содержания чего-либо, сообщение, реферат. 21. Место общественного питания. 23. Человек, взявший что-либо взаймы, неуспевающий студент. 24. Талантливый журналист, создавший ряд программ на телеканале "Останкино" и стоявший у истоков ОРТ.

*Составила Сердобинцева Елена, студентка 2 курса факультета журналистики БГУ*

---


БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

Заснавальнік газеты - рэктарат Беларускага дзяржаўнага універсітэта

Мінская паліграфічная фабрыка "Чырвоная зорка" МВПА імя Я.Коласа. 220079, г. Мінск, 1-ы Загарадны зав., 3.

Газета падпісана ў друк у 12.00.

26 ВЕРАСНЯ
Зак. 2009.
Т. 1000 экз.

220080, Мінск-80, Універсітэцкі гарадок, вул. Бабруйская, 9, паверх 4, пакоі 411-412, тэлефон 206827.

В.а. рэдактара
Т.М. Казак